1941—44 гг.; на магіле ахвяр фашызму. Захаваўся помнік архітэктуры 71 ст.— кляштар бернардзінцаў.

Літ.: Сапунов А., Друцкий-Любецкий В. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии.— Витебск, 1896; Hedemann O. Dzisna i Druja. Magdeburskie miasta.— Wilno, 1934.

С. Г. Багласаў, А. П. Грыцкевіч.

482. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). У цэнтры пасёлка, у скверы. Пахаваны 146 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

483. КЛЯШТАР БЕРНАРДЗІНЦАЎ (архіт.). Размешчаны ў паўночнай частцы пасёлка, на высокім беразе р. Заходняя Дзвіна. Пабудаваны ў 1643—46 гг. з цэглы (фундатар — К. Л. Сапега). Складаецца з Троіцкага касцёла і жылога корпуса.

Касцёл — аднавежавая, трохнефавая базіліка з паўцыркульнай апсідай, аднабаковай сакрысцыяй і прыбудовамі да вежы. Касцёл вырашаны ў спрошчаных масіўных формах. Галоўны фасад мае ступеньчатую кампазіцыю, утворануюшчытом фасада з валютамі над бакавымі нефамі і высокай вежай у цэнтры. Вежа пяціярусная, увянчаная фігурным купалам (дабудаваны ў 1772 г.). Сцены вежы прарэзаны маленькімі паўцыркульнымі і круглымі аконнымі праёмамі, раскрапаваны вуглавымі пілястрамі і карнізнымі паясамі. Цэнтральны ўваход — у неглыбокай нішы. Бакавыя сцены касцёла і апсіда ўмацаваны магутнымі контрфорсамі і прарэзаны высокімі паўцыркульнымі аконнымі праёмамі.

Інтэр'ер касцёла перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі. Бакавыя сцены цэнтральнага нефа раскрапаваны пілястрамі і шырокай карнізнай цягай, дэкарыраваны філёнгамі, ляпным геаметрычным і раслінным арнаментам, галоўкамі пуцці. Плоскасці арак расчлянёны тонкімі арнаментальнымі кесонамі з ляпнымі разеткамі. Дэкор мае рэнесансавы характар — плоскасны, раўнаважны, з вельмі тонкай і лёгкай прарысоўкай усіх форм. Інтэр'ер вырашаны ў 2 колерах: скляпенні, якія апіраюцца на часткі сцен і калоны, пакрыты светлай вохрай, накладныя ордэрныя элементы і філёнгі белыя. Алтары ў галоўным і бакавых нефах і амбон пабудаваны ў 1764—67 гг. у стылі сталага барока. Цэнтральны алтар двухступеньчаты, двухярусны. Пластыка яго заснавана на спалучэнні пілястраў і калон з гнутымі раскрапаванымі карнізнымі паясамі і скульптурнымі ўстаўкамі. Па такім прынцыпе зроблены і 4 астатнія алтары.

Жылы корпус — двухпавярховы аб'ём, які ўтварае прамавугольны ўнутраны двор, прымыкае да паўночнай бакавой сцяны касцёла. З боку двара з трох бакоў праходзіць каліdор, перакрыты крыжовымі скляпеннямі. Прамавугольныя ў плане пакоі маюць цыліндрычныя і плоскія перакрыцці. Вуглавыя пакоі большыя за астатнія і выступаюць за агульны прамавугольны абрыс плана. Пластыка жылога корпуса простая: прамавугольныя вокны на гладкіх атынкаваных сценах і вузкі завяршальны карніз, які з'яўляецца адзіным ордэрным элементам.

Перад касцёлам брама з агароджай, пабудаваная ў сярэдзіне 18 ст. ў стылі позняга барока.

Кляштар — адзін з цікавых помнікаў архітэктуры ранняга барока на Беларусі.


Літ.: Lorentz S. Wycieczki po województwie Wileńskiem.— Wilno, 1932; Hedemann O. Historja powiatu Brasławskiego.— Wilno, 1930.

С. Г. Багласаў.

484. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На правым беразе р. Друйка, на тэрыторыі сядзібы (вул. Браслаўская, 5). Тут нямецка-фашысцкія акупанты ў 1942—43 гг. закатавалі 700 мірных жыхароў. У 1962 г. на магіле ўстаноўлены мемарыяльны знак.



483. Кляштар бернардзінцаў. Касцёл.



483. Кляштар бернардзінцаў. План.



485. Помнік на месцы бою 1812 г.

485. МЕСЦА БОЮ 1812 ГОДА (гіст.). На заходняй ускраіне Друі, злева ад дарогі на Браслаў. 3.7.1812 г. атрад рускіх войск пад камандаваннем генерал-маёра Я. П. Кульнёва разграміў брыгаду французскай конніцы. У 1962 г. на месцы бою пастаўлена стэла з надпісам, які ўслаўляе перамогу рускіх воінаў.

486. ПАРК (архіт.). На левым беразе Заходняй Дзвіны, уздоўж галоўнай вуліцы пасёлка. Закладзены ў 18 ст. як частка былога палацавага комплексу Сапегаў. Цяпер парк належыць санаторыю «Друя».

Парк рэгулярнага тыпу, выцягнуты з усходу на захад, плошча каля 4 га. У паўднёвай частцы парку некалькі старых алей, размешчаных перпендыкулярна і паралельна галоўнай, у заходняй частцы захаваліся старыя ліпы; трапляюцца экзоты — вяз шурпаты ніцы, конскі каштан звычайны. Маладыя пасадкі дрэў мясцовых парод утвараюць суцэльны масіў. Да парку прымыкае пладовы сад.

Парк — помнік садова-паркавага мастацтва.

Т. В. Габрусь.

в. Дрысвяты, цэнтр сельсавета

487. ЗАМЧЫШЧА (археал.). На востраве воз. Дрысвяты. Займае высокі (да 8 м) пагорак. Плошча каля 1 га. Умацавана валам, месцамі ўцалелым на вышыню да 2 м. Узнікла ў 11 ст. на месцы гарадзішча днепра-дзвінскай культуры. Было парубежным паселішчам Полацкай зямлі. З паўночнага боку да замчышча прымыкаў пасад плошчай каля 3 га. Вядома з 16 ст. У «Хроніцы Еўрапейскай